Ігуменскі тракт
№ 11 (26)

■ Народныя мудраслоўі

«ПЕРШЫ ГРОМ НА ГОЛЫ ЛЕС — ЧАКАЙ НЕЎРАДЖАЮ...»

Ва ўсходнеславянскай народнай традыцыі супрацьстаянне *голы* (непакрыты, лысы) — *пакрыты* (прыбраны, зачынены, абаронены) з'яўлялася адным з сістэмаўтваральных. У сімвалічных адносінах прыкмета *голы* мае значэнне *бедны, бясплодны, галодны* і супрацьпастаўлена *няголаму, пакрытаму* як *багатаму, сытаму, памнажальнаму*. *Голае* або *непакрытае* было сімвалам беднасці, адзіноты і, наадварот, *махнатае, пакрытае, загорнутае* ў што-небудзь сімвалізавала дабрабыт і багацце, а таксама лічылася абярэгам.

Супрацьстаянне *голы — пакрыты* ўсебакова праяўлялася і ў назіраннях за станам прыроды, і ў ключавых момантах сельска-гаспадарчай дзейнасці, і, вядома ж, у абрадава-магічнай практыцы беларусаў. Адной з найбольш распаўсюджаных народных прымет з'яўляецца тая, у аснове якой ляжыць назіранне за станам дрэў у момант першай веснавой навальніцы: «Калі першая навальніца прагрыміць на **голы** лес, чакай неўраджай, галодны год, хваробы, эпідэміі і т. п.». На Магілёўшчыне існавала строгая забарона спяваць летнія песні, пакуль лес «не апранецца».

Дасведчаная бабка-павітуха ведала, што прымаць дзіця **галаруч** нельга. Для гэтага рыхтавалі пялёнкі часцей за ўсё са старой бацькаўскай кашулі ці ніжняй спадніцы парадзіхі: «... каб дзіця ніколі не было **голае**, а заўжды жыло ў багацці» або з новага палатна: «Бабка прымае дзіця, што выходзіць на святло Божае, не *голымі* рукамі, а абгарнуўшы рукі новым палатном, каб у будучыні дзіця не жыло з **голымі** рукамі». Бабка-павітуха, пераразаючы пупавіну дзіцяці і перадаючы яе маці, таксама брала яе не **«галаруччу»**, а праз фартух або край адзежы.

Прадаючы карову, добры гаспадар ведаў, што аддаваць яе неабходна разам з вяроўкай, якую перадавалі новаму гаспадару праз крысо адзення (**не галаруч**), прыгаворваючы: *«Прапала кароўка, прападай і вяроўка»*. На Брэстчыне першае знесенае яйка гаспадыня брала праз фартух, каб курыца стала добрай нясушкай.

Перад тым, як запрасіць сям'ю паабедаць, гаспадыня заўсёды накрывала стол абрусам. Пасля таго, як з печы вынімалі хлеб, у яе абавязкова клалі некалькі паленаў, каб печ не была пустой, **голай**, і закрывалі засланкай: «...печ у хаце нельга пакідаць адкрытай, бо тады адкрыюцца чужыя раты, каб абгаварыць каго-небудзь з сямейнікаў».

Прыкмета *пакрыты* стаяла ў адным асацыятыўным шэрагу з *касматым, валахатым* і таксама лічылася знакам багацця і поспеху. Падчас калядных варожбаў аб тым, бедным або багатым будзе будучы муж, дзяўчаты ў лазні «загаляліся», г.зн. падымалі ніжнюю спадніцу, і прасілі лазніка дакрануцца: калі рука была **голай** — жыць у беднаце, *касматай* — у багацці. Або рабілі так: дзяўчаты прасоўвалі руку ў лазню і вадзілі ў поцемках па сцяне. Калі пад руку трапіць **голае** бервяно, то, лічылася, што жаніх будзе з беднай сям'і, калі ж пад руку трапіць мох паміж бярвёнамі — гэта было прадказаннем будучага багацця.

На Гомельшчыне лічылі, калі ў *Чысты чацвер* апынуцца апоўначы на гарышчы з запаленай свечкай, то можна ўбачыць дамавіка: «Як дамавы кашлаты, то будэ хазяін багаты». Сёння выраз «з касматай рукой» гаворыць пра нечую фінансавую падтрымку.

Падчас вяселля ролю абярэга маладых, або так званага экрана, выконвалі вэлюм і вяночак, а далей чапец або намітка нявесты, хусткі, праз якія трымалі вянчальныя свечкі і царкоўныя вянцы над галовамі маладых, ручнік ці хустка, праз якія сват ці шафер вёў нявесту ў хату пасля выкупу; ручнікі, на якіх выносілі абраз і абрадавы хлеб; посцілкі, якімі высцілалі дарогу маладым; кажух ці падушка, на якіх сядзелі маладыя падчас вясельнай бяседы. Падчас адорвання маладых талерку, на якую клалі грошы, трэба было таксама заслаць хусткай ці ручніком. Прымаць долю вясельнага каравая з рук свата неабходна было таксама «на хустку».

У гэтым выпадку спрацоўваў усё той жа прынцып «падобнае выклікае падобнае». Лічылася, што **голыя** рукі, якія былі задзейнічаны ў абрадавай практыцы, правакавалі жыццёвую ці гаспадарчую «пустэчу» (безграшоўе); маладым нельга было злазіць з воза на **голую** зямлю і садзіцца на **голую** лаўку за вясельным сталом, каб не наклікаць бясплоддзе. Так і з тым самым голым лесам падчас першай навальніцы: ***«Калі першы раз загрыміць, як ужо лес адзенецца ў лісце, то будзе ўраджайны год, а калі на голы лес, то ўсё будзе гола».***

Аксана КАТОВІЧ,
Янка КРУК

■ Геральдычная калекцыя

ГОНАР РАДАВОДУ

БЕЛАРУСКІЯ ШЛЯХЕЦКІЯ ГЕРБЫ

Вядучы рубрыкі Уладзімір КРУКОЎСКІ.

ЗАРЭМБА

У шэрым полі белы мур, на ім тры залатыя кветкі, за мурам чорны леў у кароне, налева абернуты, з пашчы полымя.

Булакоўскі, Бычкоўскі, Гаршчэўскі, Гінейт, Гінтар, Гінцытовіч, Грабоўскі, Давойна, Зарэмба, Заянчкоўскі, Ісудовіч, Кавалеўскі, Каліноўскі, Крачкоўскі, Куцяк, Ранцэвіч, Рудзінскі, Сухарэўскі, Тымянецкі, Ябланоўскі.

ЗНІН

У срэбным полі чырвоная літара «S»

Аўгустовіч, Аўгутовіч, Банькоўскі, Барташэвіч, Барычэўскі, Бянткоўскі, Бярнацкі, Бетыгольскі, Ганевіч, Германовіч, Гірын, Дзядровіч, Кунцэвіч, Лантквіч, Лістападскі, Ляўшэвіч, Некраш, Пашакінскі, Прымульскі, Пяткевіч, Тарашкевіч, Трускоўскі, Шчэрба, Ясінскі.

ДЭ ВАЛЬДЭН

У блакітным полі тры чорныя стралы побач, вастрыём угору.

Дэ Вальдэн

КАЛАМАНЯКА

У срэбным полі дзве скрыжаваныя наўкос стралы вастрыямі дагары, паміж імі меч з чырвоным тронкам лязом направа.

Фелтнер.

■ Брэнд краіны

Гаючая энергетыка вялікай ракі

Месца, дзе пачынаецца Нёман

Пра тое, што Нёман павінен значыць для беларусаў не меней, чым Волга для расіян або Тэмза для англічан, задумаліся ва Уздзенскім гісторыка-краязнаўчым музеі. Разважаючы над гэтым, там нават прапануюць уласны брэнд: «Уздзеншчына — выток Нёмана».

Фота Ніны ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Васіль Лычкоўскі нечым падобны да славутага земляка Наркевіча-Ёдкі.

Месца вытоку такой буйной ракі заўсёды лічыцца сакральным. Аднак дакладна вызначыць яго сёння немагчыма. Бо крынічка, якая некалі разбягалася ў два бакі, а пасля, зноў злучаючыся, давала пачатак магутнаму Нёману, знікла падчас меліярацыі. Быў і камень, з-пад якога біла крыніца, аднак, па чутках, яго ўзарвалі, а кавалкі вывезлі на будаўніцтва дарогі Мінск — Слуцк. Таму ад сапраўднага вытоку каля Узды сёння нам засталася толькі прыгожая легенда, у якой апавядаецца пра тое, як пачынаецца Нёман...

З-пад лазовага кусціка ды з-пад каменя выбівалася крынічанька і цудадзейным чынам разбягалася ў розныя бакі. Дзіву даваліся людзі: як такое магло здарыцца? Назіралі, любаваліся неверагоднаю з'явай, седзячы на тым камені. Выслухвалі яны аповеды хуткай вады, ды так і прыдумалі тлумачэнне гэтай чароўнай з'яве. Адной ручаінцы далі імя жаночае — Лоша. Другую назвалі мужчынскім — Неманец. Цяклі яны сабе паасобку ды дужэлі, п'ючы ўдосталь талыя снягі ды падарункі шчодрага дожджыку. І вось ужо не ручайкі — рэкі шырокія рассякалі прасторы лугоў, палёў, лясоў ды ўзгоркаў. Радаваліся людзі, гледзячы на іх, сяліліся на ўзбярэжжах. Бо не толькі рыбаю забяспечвалі іх Неманец і Лоша, але і сродкам зносін зрабіліся. І паплылі з краю ў край гандлёвыя плыты ды караблі. І яшчэ адна загадка не давала спакою людзям: ну навошта злучаюцца рэкі? Ну цяклі б сабе паасобку да мора ці акіяна. Дык не, аб'ядноўваюцца, знікаюць самі, каб нарадзіць новае жыццё, з надзеяй, што яно будзе лепшае. Вось і Лоша з Неманцом нядоўга цешыліся воляю і самастойнасцю. Засумавалі, кінуліся насустрач адно аднаму і зліліся ў шырокую ды магутную рэчку. І назву далі ёй людзі незвычайную — Нёман. Слова гэта гаворыць само за сябе: дзвюх рэк не стала, зніклі, нарадзіўшы новае жыццё — «няма», «неман», «нёман»...

І гэта толькі адна з легендаў аб паходжанні магутнай ракі. А ва Уздзенскім гісторыка-краязнаўчым музеі адзначаюць, што няма праблемы ў тым, каб сёння зрабіць новы выток Нёмана — і яго нельга будзе лічыць несапраўдным. Бо месца пачатку ракі прыблізна вылічыць можна, і дастаткова прабурыць свідравіну глыбінёй 10-15 метраў — і вада абавязкова заструменіць. Добраўпарадкаваць навакольную тэрыторыю, зрабіць пад'езды — і мы зноў займеем выток Нёмана.

Навакольныя мясціны сапраўды незвычайныя і маюць моцную станоўчую энергетыку. **Дырэктар Уздзенскага гісторыка-краязнаўчага музея Тамара ЛУХВЕРЧЫК** расказала, што гісторыя сведчыць пра вялікую жыццядайную сілу наваколля вытоку Нёмана. І гэта пацвярджаецца на прыкладзе славутага ўраджэнца гэтых мясцін Якуба Наркевіча-Ёдкі. Расказвае Тамара Лухверчык :

— На прасторах ад самага пачатку Нёмана і амаль да маёнтка Наркевіча-Ёдкі ніколі не было эпідэмій, хвароб — прырода сама змагалася з адмоўнай стыхіяй. У небяспечны час людзі з навакольных вёсак сяліліся тут і чакалі, пакуль пройдзе эпідэмія. Наркевіч-Ёдка — унікальны чалавек, так дарэчы мастак Міхаіл Рагалевіч намаляваў яго такім светлым, адухоўленым, які нясе добрую, станоўчую аўру. На месцы маёнтка зараз засталіся руіны, аднак сама зямля — яна жыватворная. Турысты, якія да нас прыязджаюць, кажуць, што насычаюцца там прыроднай энергіяй. Яшчэ ніводзін чалавек не паехаў адсюль абыякавым — усе штосьці для сябе атрымалі.

На Уздзеншчыне, па падліках супрацоўнікаў музея, нарадзіўся 21 пісьменнік, 14 мастакоў, 11 акадэмікаў. Відаць, сапраўды зямля тут незвычайная. **Мясцовы энтузіяст Васіль ЛЫЧКОЎСКІ** расказаў, што выпрабаваў на сабе, што такое сіла прыроды. Ён амаль поўнасцю страціў здароўе, аднак сапраўднае адраджэнне перажыў, трапіўшы ў гэтыя мясціны. Таму, зыходзячы з уласнага вопыту, Лычкоўскі прапануе стварыць новы этнаграфічна-аздараўленчы турыстычны маршрут:

— Гэты маршрут будзе паляпшаць энергетыку: здымаць дэпрэсію, хандру, меланхолію — чалавек стане больш паспяваць і рабіць усё з радасцю. Уявіце, вы прыязджаеце да вытоку Нёмана. Ён ужо абсталяваны — стаіць прыгожая скульптурная кампазіцыя. Побач зроблены міні-вадаём: плашкі з лістоўніцы або дубу, у іх вада сцякае, яе можна папіць. Далей вада па лесвічцы трапляе ўніз — туды можна акунуцца. Што адбываецца? Выток нацыянальнай ракі будзе аказваць уздзеянне на чалавека. З ім будзе адбывацца прыкладна тое ж, што робіцца на Вадохрышча, толькі скакаць у палонку не трэба, можна прыходзіць у любы сезон. Мы хочам таксама абсталяваць пяць метраў рэчышча, насыпаўшы жвіру. Там можна будзе разуцца і пахадзіць басанож. Вернік можа хадзіць, чытаючы малітву «Ойча наш» — разоў сорак туды і назад. Што адбываецца? Вада, холад, паветра, сонца. Будзе адбывацца ўздзеянне на падэшвы, а на іх знаходзіцца каля тысячы акупунктурных кропак. Адтуль чалавек выйдзе зусім іншым. Калі раніцай — зможа насыціцца энергіяй. Калі, наадварот, энергія лішняя і трэба супакоіцца — лепш зрабіць гэта вечарам.

Яшчэ адзін верагодны пункт наведвання на гэтым маршруце — дуб-асілак пяці з паловай метраў у дыяметры і прыкладна трыццаці метраў у вышыню. Такія дрэвы, як дуб, бяроза, сасна, адзначае Лычкоўскі, аддаюць сваю энергію. Таму, адпачыўшы ля гэтага дуба, таксама можна атрымаць пэўны станоўчы зарад.

Аўтар маршруту расказаў і аб прошчы — месцы зліцця рэк, дзе ўтвараецца Нёман. Яно таксама валодае жыватворнай энергіяй. «Калі мала сіл, трэба паляжаць там хаця б паўгадзінкі, — кажа Лычкоўскі. — Пасля чалавек сам здзівіцца: і куды што дзелася?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Стужка Нёмана.

Праехаўшыся па гэтым маршруце, чалавек напоўніцца здаровымі вобразамі».

Перспектыва аднаўлення вытоку Нёмана вымалёўваецца не тое што вельмі добрай, але нават захапляльнай. Аднак як жа ўвасобіць усе ідэі ў рэальнасць? Ва Уздзенскім гісторыка-краязнаўчым музеі была арганізавана канферэнцыя, прысвечаная вытоку Нёмана. Арганізатары адзначаюць, што яна была пакуль проста ўстаночвачай. Усе зацікаўленыя і неабыякавыя асобы пазнаёміліся паміж сабой, высветлілі, у якім кірунку рухацца далей. Было выравашана, што трэба ўсё абгрунтаваць, упарадкаваць і з канкрэтнымі прапановамі выйсці на кіраўніцтва. У першую чаргу плануюць звяртацца ў мясцовы райвыканкам. Аднак ёсць ідэя стварэння таксама апякунскай рады, якая аб'яднае і прадпрымальнікаў, і энтузіястаў — хтосьці зможа дапамагаць фінансава, хтосьці — словам, ідэяй. Будзе вырашацца і юрыдычнае пытанне — адкрыццё добраахвотнага рахунку для падтрымання брэнда «Уздзеншчына — выток Нёмана».

Намеснік старшыні Уздзенскага райвыканкама Яўген ШКЕЛЬ адзначыў, што яму вельмі спадабаліся прапановы Васіля Лычкоўскага па аднаўленні вытоку Нёмана і новым турыстычным маршруце, аднак заўважыў:

— У нас на двары сёння рынкавая эканоміка. Таму любая справа павінна арганізоўвацца з мэтай атрымання прыбытку. Аднак калі будзе такі шырокі пачатак гэтай справы, яе ідэя стане нацыянальным здабыткам, фінансы на самае неабходнае мы знойдзем. Што датычыцца вытоку Нёмана, трэба стварыць краязнаўчую экспедыцыю, дакладна высветліць, дзе ён быў, і абсталяваць імправізаваны выток там, дзе трэба, зрабіць пад'езд і забяспечыць мінімальную ахову месца, каб прадухіліць вандалізм. Таму трэба стварыць невялікую, але дзейную арганізацыю зацікаўленых людзей, якія б, прама скажам, працавалі за ідэю — такіх людзей у нас дастаткова. І рухацца наперад. Як той казаў, кропля камень точыць не ад моцы ўдару, а ад частаты пападання.

«Ой, Нёман, і песня і слава народа майго і зямлі» — спяваецца ў добра вядомай і любімай усімі песні. Пэўна, у многіх яна выклікае не толькі добрыя ўспаміны, але і адчуванне чагосьці вельмі роднага і блізкага. Думаецца, надышоў той час, калі Нёман павінен стаць ракой не толькі тых, хто каля яе жыве ці выпадкова апынуўся побач, але і агульнанацыянальным гонарам і сімвалам. Нёман апеты многімі паэтамі і пісьменнікамі, ён намаляваны шматлікімі мастакамі, ды і на стварэнне прыгожай музыкі ён натхніў многіх кампазітараў. І, што самае адметнае, Нёман, як іншыя беларускія адметнасці, нікуды не знік, не быў разбураны ліхалеццямі — наш Нёман і сёння вабіць, супакойвае, натхняе кожнага, хто дакранецца да яго лагодных хваляў. Таму ўсім беларусам сёння патрэбен Нёман, а Нёману — яго выток.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ,
г. Узда

ДАВЕДКА:

Нёман бярэ пачатак ля Мінскай узвышанасці, працякае праз Беларусь, перасякае таксама Літву і Калінінградскую вобласць Расіі. Рака ўпадае ў Куршскі заліў Балтыйскага мора, дзе стварае дэльту з астравамі. Даўжыня Нёмана амаль што 1000 кіламетраў. Гэта магутная рака мае каля 180 прытокаў. Канал Агінскага яднае яе з Дняпром, Аўгустоўскі канал — з Віслай.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Магутны дуб каля Нёмана.

■ 100 славутых прозвішчаў Беларусі

Малахоўскія

Да нашага часу застаецца шмат нераскрытых старонак беларускай гісторыі, яшчэ больш застаецца невядомых імёнаў і прозвішчаў нашых землякоў, якія ўнеслі значны ўклад у сусветную гісторыю. Да ліку такіх асоб належыць Уладзіслаў Юльянавіч Малахоўскі.

УЛАДЗІСЛАЎ МАЛАХОЎСКІ — СТВАРАЛЬНІК ПРАТАТЫПА «КОДАКА»

Уладзіслаў Малахоўскі нарадзіўся ў 1827 годзе ў маёнтку Маце Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (сёння гэта Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці). Пасля хатняга навучання юнак набываў веды ў Свіслацкай гімназіі, якая адкрыла дарогу ў свет многім славутым людзям Беларусі. Пасля гімназіі вучыўся ў Пецярбургскім інстытуце шляхоў зносін. Там, у тагачаснай сталіцы Расійскай імперыі, і авалодалі маладым чалавекам ідэі барацьбы за пераўтварэнне грамадства. Малахоўскі наладзіў кантакты з тайнай рэвалюцыйнай арганізацыяй разначынцаў «Зямля і воля». У Пецярбургу Уладзіслаў пазнаёміўся з Кастусём Каліноўскім. Таму, калі пачалося паўстанне пад кіраўніцтвам Каліноўскага, члены арганізацыі «Зямля і воля» ўступілі ў саюз з партыяй «чырвоных». Малахоўскі прыклаў шмат намаганняў, каб ператварыць гэтае выступленне ва ўсерасійскае сялянскае паўстанне за зямлю і волю. Ён стаў адным з кіраўнікоў партыі «чырвоных»: займаў пасаду начальніка паўстанцаў Вільні. Калі ў Вільні заставацца стала небяспечна, Малахоўскі ў 1863 годзе перабраўся за мяжу — у Кёнігсберг, дзе займаўся закупкай і дастаўкай зброі для паўстанцаў Каліноўскага. Удзельнічаў у выданні газеты «Глос з Літвы».

Пасля задушэння паўстання Каліноўскага Малахоўскі выехаў у Лондан, дзе жыў пад імем Леона Варнэрке. У англійскай сталіцы наш зямляк заснаваў уласную фірму, якая займалася фотасправай. Ужо праз пяць гадоў гэтая фірма стала шырока вядомай ва ўсёй Заходняй Еўропе. Гэта сталася дзякуючы намаганням Уладзіслава Малахоўскага, які вынайшаў спецыяльную прыладу — сенсітометр, а ў 1875 годзе сканструяваў фотаапарат са скручанай касетай, які спецыялісты лічаць прататыпам «Кодака». Важны ўклад унёс Малахоўскі ў сам працэс фатаграфавання: фотапласцінкі ён замяніў на плёнку, пакрытую бромсерабром. Яго адкрыццё выклікала пераварот у сусветнай фотасправе, паколькі нічога падобнага дагэтуль у свеце не было. Малахоўскі пачаў ездзіць па розных краінах і прапагандаваць свае адкрыцці. Пабываў і ў Расіі — у Маскве ў 1882 годзе праходзіла Усерасійская выстава. Адкрыццямі нашага земляка захапляўся вядомы расійскі вучоны-хімік Дзмітрый Мендзялееў. Уладзіслаў Юльянавіч абмяркоўваў разам са славутым вучоным ідэю аб заснаванні секцыі фатаграфіі Расійскага імператарскага тэхнічнага таварыства. У выніку гэта ідэя спраўдзілася.

Малахоўскі ў 1875 годзе сканструяваў фотаапарат са скручанай касетай, які спецыялісты лічаць прататыпам «Кодака».

Фірма Малахоўскага імкліва развівалася. Сведчаннем гэтага служылі шматлікія філіялы не толькі ў Вялікабрытаніі, але і ў іншых еўрапейскіх краінах. Але, на жаль, дзейнасць фірмы была азмрочана абвінавачваннямі ў выкарыстанні фальшывых расійскіх рублёў адным з філіялаў лабараторыі. Пазней віна Малахоўскага ў з'яўленні фальшывых грошай у судзе не была даказана. Верагодна, такім чынам вырашылі падставіць паспяховага вынаходніка яго канкурэнты. Магчыма, былі іншыя прычыны. Беспадстаўныя абвінавачванні выклікалі цяжкія перажыванні ў Малахоўскага. Нягледзячы на апраўдальны вердыкт суда, душэўнае супакаенне не прыйшло: 7 кастрычніка 1900 года Уладзіслаў Малахоўскі, не вытрымаўшы маральных пакут, застрэліўся.

Невядома, ці з'явілася б фірма «Кодак», фотаапараты якой сёння карыстаюцца папулярнасцю ва ўсім свеце, калі б беларуская зямля не падарыла свету Уладзіслава Малахоўскага.

ПАХОДЖАННЕ ПРОЗВІШЧА

Часам паходжанне прозвішча *Малахоўскі* звязваюць з імем бажаства Молаха, якое ўпамінаецца ў Бібліі. *Молах* у пісьмовых крыніцах апісваецца ў выглядзе чалавека з галавой быка і працягнутымі ўперад рукамі. Асаблівасцю пакланення гэтаму бажаству было прынясенне ў ахвяру дзяцей, якіх спальвалі на агні. Таму, відаць, і ўзнікла меркаванне, што ў далёкім мінулым некаторыя бацькі, каб засцерагчы дзяцей ад уздзеяння злых сіл, маглі даваць ім імя Молах, якое пазней перайшло ў прозвішча. Аднак такую думку нельга лічыць навукова абгрунтаванай. Пакланяліся Богу Молаху сірыйцы, фінікіяне, аманіцяне. Для ўсходнеславянскіх зямель культ Молаха не быў характэрны.

Навукова даказана, што ў аснову прозвішча Малахоўскі пакладзена старажытнае хрысціянскае кананічнае імя Малахія, якое прыйшло да нас са старажытнаяўрэйскай мовы, дзе літаральна азначала «пасланец Бога».

Імя Малахія зрэдку фіксуецца ў старабеларускіх помніках XVI — XVII стст.: *от пана Малахия Андреевича Казкевича* (Гісторыка-юрыдычныя матэрыялы, атрыманыя з актавых кніг Віцебскай і Магілёўскай губерняў, 1691). Але найбольшае распаўсюджанне гэта царкоўнае імя ў беларускай мове атрымала ў дзвюх формах: Малафей і Малах: Малах Насовіч (1614, Аршанскі павет), Малах Іванавіч (Магілёў, 1635), Малафей Кананові́ч (Мінскі павет).

СУЧАСНЫЯ МАЛАХОЎСКІЯ

Прозвішча *Малахоўскі* даволі часта сустракаецца на тэрыторыі сучаснай Беларусі: Браслаўскі, Верхнядзвінскі, Віцебскі, Мёрскі, Лёзненскі, Расонскі, Талачынскі, Ушацкі раёны Віцебскай вобласці; Лоеўскі, Рэчыцкі, Чачэрскі раёны Гомельскай вобласці; Воранаўскі, Дзятлаўскі, Карэліцкі, Лідскі раёны Гродзенскай вобласці; Кіраўскі, Клімавіцкі, Клічаўскі, Крычаўскі, Слаўгарадскі раёны Магілёўскай вобласці; Барысаўскі, Валожынскі, Мінскі, Пухавіцкі, Слуцкі, Смалявіцкі, Клецкі раёны Мінскай вобласці, горад Мінск. Неаднаразова на нашых землях адзначаюцца і аднакаранёвыя прозвішчы: *Малах* (Бешанковіцкі, Чашніцкі раёны Віцебскай вобласці; Асіповіцкі раён Магілёўскай вобласці), *Малаха* (Ашмянскі, Карэліцкі раёны Гродзенскай вобласці; Магілёўскі раён), Малахаў (Бярозаўскі, Івацэвіцкі, Камянецкі, Лунінецкі раёны Брэсцкай вобласці; Аршанскі, Гарадоцкі, Дубровенскі, Лёзненскі, Пастаўскі, Полацкі, Расонскі, Сенненскі, Талачынскі, Ушацкі, Шумілінскі раёны Віцебскай вобласці; Буда-Кашалёўскі, Лоеўскі, Рагачоўскі, Рэчыцкі, Светлагорскі раёны Гомельскай вобласці; Берастаўцкі раён Гродзенскай вобласці; Бабруйскі, Быхаўскі, Бялыніцкі, Глускі, Горацкі, Касцюковіцкі, Кіраўскі, Клімавіцкі, Краснапольскі, Крычаўскі, Магілёўскі, Мсціслаўскі, Слаўгарадскі раёны Магілёўскай вобласці; Слуцкі, Стаўбцоўскі раёны Мінскай вобласці; горад Мінск), *Малахвей* (Ваўкавыскі, Свіслацкі раёны Гродзенскай вобласці; Нясвіжскі раён Мінскай вобласці), *Малаховіч* (Баранавіцкі, Пінскі раёны Брэсцкай вобласці; Верхнядзвінскі, Дубровенскі раёны Віцебскай вобласці; Астравецкі, Слонімскі раёны Гродзенскай вобласці).

Ігар КАПЫЛОЎ